ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
3
САКАВІКА
№ 7 (1565)

Газета выдаецца з 1922 года.

Дзявочы факультэт

Вось скажыце, якой шырыні павінна быць душа, каб мужчына ў адзіночку змог павіншаваць з 8 Сакавіка, ну, прыкладна, 30 прадстаўніц цудоўнага полу? Праўда, цяжка ўявіць? Цяжка, але магчыма: мужчыны філфака з гэтай праблемай сутыкаюцца штогод, і нічога, даюць рады.

Затое, па-мойму, немагчыма пераацаніць гераічны характар мужчыны, які аддаў сябе з-за прыхільнасці да розных моў і літаратуры на пяцігадовы тэрмін існавання ў жаночым калектыве.

Першая нязручнасць чыста практычная. Кожнаму студэнту добра знаёма жаданне згубіцца сярод сабе падобных. Асабліва на лекцыі, якую часам хочацца сумленна прапусціць. Мужчына філфака не мае гэтай магчымасці. Яго прысутнасць ці адсутнасць на лекцыі так жа прыкметна выкладчыкам, як наступленне дня і ночы.

(Працяг на 2-й стар.).

ЧЫМ ЖЫВЕШ, ЖАНСАВЕТ?

«Чабурашка», Дом мод і... гардзіны

Ні смешнае страусяня, ні легкадумны матылёк, ні апетытныя чарэшанькі, пэўна, так і не пабачылі б свет, калі б не прыйшла ў дзіцячы клуб «Чабурашка» камбіната сілікатных вырабаў Галіна Мікалаеўна Бяляева. Вядомая справа, у бацькоў многіх наведвальнікаў клуба проста не хапіла б часу (адны з іх заняты навуковай і выкладчыцкай справай ва універсітэце, другія не адну змену ў тыдзень прастойваюць у цэху), каб тлумачыць, паказваць, вучыць рукадзеллю і выпальванню па дрэву. Іншыя ж і самі не ведаюць, як разблытаць шматлікія вузельчыкі ў няўмелай пакуль вышыўцы дачкі. Тут патрэбен прафесіяналізм.

А ўсе 240 яе ўнукаў з дзіцячага дома ў г. Валожыне чакаюць не дачакаюцца, калі пачнуцца заняткі па кулінарыі. Ім не хапала толькі жаравой шафы. Але ў хуткім часе Галіна Мікалаеўна, як раней, зазірнуўшы ў сумку, даставала патрэбныя абрэзкі тканіны, вынайшла і сродкі для яе набыцця, патраціўшы на гэта ганарар, атрыманы за выступленне на радыё.

— Дзіўная жанчына,— не разумеюць іншыя, назіраючы, як у клопатах праходзіць кожны яе дзень.— Хіба на рабоце і дома спраў не хапае? Нашто ёй гэты жаночы савет?

— Вось бачыце, усё ў нашым жыцці трымаецца на людзях, адданых справе,— з гарачнасцю, нібы ўступаючы ў спрэчку з гэтымі нябачнымі апанентамі, запэўнівае Людміла Андрэеўна Піліпчук, адказная за сектар сям'і і школы жаночага савета універсітэта.— І наша дзейнасць таксама.

Спачатку было рашэнне. Яно прагучала ў лютым мінулага года. Згодна з ім ва універсітэце быў створаны жаночы савет. Потым узніклі пытанні: «З кім супрацоўнічаць?», «Да каго звяртацца за парадай?», «Чым займацца?». І галоўнае: «А што, калі не той шлях абралі, вельмі ж адчуваецца дубляж дзейнасці іншых грамадскіх арганізацый?».

Можна было б не звяртаць на гэта ўвагі і рабіць выгляд пакрыўджаных: «Для нас і спраў не засталося». Тут звярнуліся за дапамогай да жанчын. Яны і падказалі той напрамак, у якім працуе жансавет вось ужо год.

— Наш час стварыў дэфіцыт чалавечых зносін. Асабліва адчуваюць яго жанчыны, вымушаныя працаваць удвая: і дома, і на рабоце,— расказвае старшыня савета Ала Станіславаўна Каспяровіч.— Асноўным лічым прынцып аздараўлення сям'і. Сустрэчы, падарожжы, работа з дзецьмі, перадача чыста жаночага вопыту «змагання» з хатнімі справамі, у чым нам дапамагаюць выстаўкі-дэгустацыі...

Формы і метады дзейнасці шукалі і выпрацоўвалі самастойна. Здаецца, якая справа жансавету да таго, што аднойчы ў рэспубліканскай газеце папракнулі прафсаюзнае бюро ў недастатковай увазе да мнагадзетных сем'яў? Але гэты факт высветліў праблему, якой і пачала займацца Таццяна Іванаўна Мацюхіна. Пакуль ідзе збор даных аб колькасці такіх сем'яў, каб упарадкаваць іх абслугоўванне ў стале заказаў, размеркаванне талонаў у пральні самаабслугоўвання.

Наступны пункт у план работы савета прапанавалі самі супрацоўніцы універсітэта.

— Нядрэнна было б стварыць нешта накшталт групы здароўя,— раздаваліся галасы то на адным, то на другім факультэце. Гучалі яны не так няўпэўнена, каб не мог пачуць савет, які з першых жа дзён неабыякава ставіўся да ініцыятывы жанчын. Зараз жадаючыя займацца гімнастыкай прыходзяць да кіраўніка групы В. В. Нікіціна, атрымліваюць абанементы ў басейн.

Часам на іх паглядаюць паблажліва, лічачы дробязнымі ўсе іх намаганні. Хто, напрыклад, назаве вялікай справу па абсталяванню сталовай НДІ ПФП? Зрэшты, гэта мог зрабіць і аддзел забеспячэння. Толькі жанчын непакоіла, каб не адчувалася потым казённая няўтульнасць. Самі выбралі гардзіны, упрыгожылі сцены карцінамі, намаляванымі дзецьмі супрацоўнікаў інстытута, прынеслі ў залу кветкі.

— Жансавет — дастаткова актыўная сіла, калі нараджаюцца прапановы і задумкі, калі ёсць жаданне,— заўважае Ларыса Уладзіміраўна Кабец, старшыня жансавета НДІ ПФП.

Разумеюць гэта і тыя, хто імкнецца дапамагчы савету: прафсаюзны камітэт, доктар філалагічных навук, прафесар Е. Л. Бондарава, загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту С. У. Макарэвіч, выхавацельніца інтэрната камбіната сілікатных вырабаў А. А. Раманчук, загадчыца клуба «Чабурашка» І. А. Майсеева.

М. ПАРХІМОВІЧ.

ФОТА РЭПАРТАЖ



Юная, разважлівая, мэтанакіраваная

Зневажаю «шэрыя» прыступкі

Прыгадваю яе маленькай дзяўчынкай. Грукаюць абцасікі па бясконцай лесвіцы. Зрэшты, надакучыла ім затрымлівацца на кожнай прыступцы. Асцярожна, каб не пакаралі за нястрыманасць, пераскокваюць. Раз-пораз усё смялей. Праз адну, дзве...

— Так атрымалася,— паціскае Наташа Аблавацкая плячыма, пачуўшы пытанне, якое, здаецца, павінна надакучыць ёй сваёй стандартызаванасцю не менш за тыя прыступкі, каб не растлумачваць, як у пятнаццаць гадоў апынулася на самым складаным аддзяленні гістфака — філасофскім.

— У пачатку шаснаццатага. Уступныя экзамены здавала ў ліпені, а пятнаццаць споўнілася аж у чэрвені.

— Як хутка перастаў гістфак рэагаваць на з'яўленне «вундэркінда»?

— Суб'ектыўна гэта адразу было непрыкметна. Універсітэт вялікі. Ніхто ніколі не пазіраў на мяне, як на з'яву. Што датычыць гістфака: заўсёды ўспрымаў спакойна. Для мяне не існуе мяжы паміж сяньняшнімі другім і трэцім курсамі: дзве пары ў дзень наведваю на адным, столькі ж на другім. З першакурснікамі была на «бульбе».

— А старэйшыя?

— Яны пры сустрэчы робяць «круглыя» вочы: «Навошта табе гэта трэба?» Гэта наконт майго «вольнага» наведвання. Здагадваюцца аб цяжары адказнасці. Уяўляеце? Я ж атрымала магчымасць спаць да паўдня! Як жа яе не выкарыстаць? Таму я супраць «вольнага» наведвання для ўсіх. Трэба мець моцную волю, каб прымусіць сябе самастойна займацца. Доўгі час да гэтага прывыкала.

— Такім чынам, твой працоўны дзень...

— Пачынаецца з ранку. Наведваю «пары». Вольна. Тыя, якія лічу неабходнымі. Магу праседжваць па восем гадзін, калі лекцыі захапляюць. Увечары — бібліятэка. Чатыры гадзіны. Абавязкова. Трэба ўвесь час вучыцца. Два разы ў тыдзень хаджу ў басейн, на тэнісныя корты. Часам не шкодзіць поўнасцю «адключыцца». Шкада, часу мала.

— Ці не здаецца, што распачала няроўнае спаборніцтва з ім?

— Не. Гэта астатнія аддаюць перавагу сну.

— Усяго ж не ахопіш.

— І не трэба. Не. Тут неабходны цвярозы разлік: што паспееш зрабіць. Што значыць, прыспешваць жыццё? Вучоба — маё жыццё. Жыццё — барацьба з «шэрасцю». Я нават не памятаю, калі скончылася дзяцінства. Здаецца, у шостым класе. Цвёрда вырашыла, што буду займацца міжнароднымі зносінамі. З тае пары для мяне існуе два вымярэнні: час вучобы і час адпачынку.

Вучуся цяжка. І не жыву весела ад сесіі да сесіі. Таму што кожны дзень рыхтуюся. Дзякуй мозгу. Ён затрымлівае на доўгі час ўсю інфармацыю. Гэта ўжо не ад мяне залежыць. А часу не хапае. Што, банальна? Глядзіце. На сон адводжу 5 — 6 гадзін. Нават калі выключу сняданкі, абеды і вячэры — не паспяваю! Не хаджу ў кіно, на дыскатэкі. Да канікул.

— І ты не лічыш, што ў жыцці без гэтага нечага не хапае?

— Я адчуваю сябе вельмі шчаслівай. Чалавек, які займаецца тым, да чаго імкнецца яго ўнутраны інтэлект, не мае права не быць шчаслівым. Многія пазбаўлены магчымасці рабіць любімую справу. Азірніцеся вакол, сярод нашых равеснікаў большасць інфантылаў. Толькі сутыкненне з цяжкасцямі робіць чалавека чалавечным. Гэтым ён адрозніваецца ад сваіх продкаў. Я ведаю, што патрэбна мне. Няхай будуць горы — звярну. Таму што гэта маё. Час мінае, а людзі спяць. Нельга так.

З. МАРАВА.

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

Свабодны абмен думкамі

ўзбагачае чалавечую свядомасць, пазнанне складаных заканамернасцей грамадскага развіцця. Да такога вываду прыйшлі ўдзельнікі пасяджэння секцыі гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, якое праходзіла ў рамках студэнцкай навуковай канферэнцыі па выніках першага тура XII Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечанай 70-годдзю Вялікага Кастрычніка і 70-годдзю ВЛКСМ.

Быў заслуханы 41 даклад. Лепшымі, на думку ўдзельнікаў канферэнцыі, былі выступленні Т. Ціхалік (фізфак, I курс), К. Цішчанка (мехмат, II курс), А. Баева, Ю. Жэрко (геафак, II курс), М. Леўшына (мехмат, I курс), Ю. Аўчарук (біяфак, I курс).

Абмеркаванне праходзіла нефармальна, усе ўдзельнікі канферэнцыі імкнуліся выказаць свае думкі, часам не згаджаліся з выкладчыкам. Шмат цікавых пытанняў было зададзена па дакладу, які падрыхтаваў студэнт II курса мехмата А. Піскароў. Доўга дыскусіравалі студэнты пасля выступлення першакурсніка хімфака С. Зотава.

Т. ПРЫТЫЦКАЯ,
загадчыца кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, прафесар.

Ці ведаеце вы

тое, што кнігі, якія рыхтуюцца да выпуску ў будучым годзе цэнтральнымі і рэспубліканскімі выдавецтвамі, можна заказаць ужо сёння. Гэта сэканоміць ваш час і з'явіцца гарантыяй набыцця патрэбнага выдання.

У кніжны кіёск, які знаходзіцца ў галоўным корпусе універсітэта, паступілі тэматычныя планы выдавецтваў «Высшая школа», «Московский университет», «Международные отношения» і інш. Спяшайцеся аформіць папярэдні заказ.

І. ВАЛАСЕВІЧ.

Дзявочы факультэт



(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

Вялікая нязручнасць — маральная. Вы не паверыце, калі скажу, што на філфаку бывае быць цалкам джэнтльменам. Бо калі выказваць элементарную ветлівасць, прапускаючы наперад даму, то ля дзвярэй можна пратырчаць некалькі гадзін. Што ж датычыць астатніх знакаў увагі, то іх вельмі цяжка пароўну размеркаваць сярод шматлікіх Дульсіней, Лаур і

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ПРА САМЫХ, САМЫХ...

Чулая, гаспадарлівая, гасцінная

У дадатак — слова чарадзейнае

«ДРУГОЙ МАЦІ» іншы раз называюць яе. Бо з ёю можна пагаварыць не толькі пра надвор'е, але і атрымаць своечасовую параду, вельмі важную і неабходную порцыю дабрыні і ўвагі. Неабходную асабліва тым, чыя радзіма знаходзіцца за блізкі свет. Нават той, каму хоць аднойчы давялося перакусіць у гэтым буфеце, доўга не забудзе шчырую на ўсмешкі і «чарадзейныя» словы жанчыну, якая працуе тут. А што датычыць замежнікаў, якія вучацца ў БДУ і ходзяць на заняткі ў корпус па вул. Бабруйскай, 9 (як гавораць, «будынак бухгалтэрыі»),— буфетчыцу Лідзію Мікіцічну Дзмітрыеву ведаюць і любяць усе без выключэння.

Мы ўжо неяк звыкліся са стэрэатыпам грамхарчу — гэта там, дзе і кормяць, і абслугоўваюць, мякка кажучы, не так, як дома. Таму калі сустракаем такіх людзей, як Мікіцічна, здзіўляемся. У яе буфеце заўсёды разнастайны асартымент (і гэта важна, таму што буфет зусім маленькі), у ім чыста, утульна, акуратна. Вам заўсёды пажадаюць «Прыемнага апетыту!» і «Добрага здароўя!», не пашкадуюць добразычлівага позірку і цёплага «калі ласка». Магчыма таму не трэба вывешваць для наведвальнікаў аршыннымі літарамі заклік: «Чыста не там, дзе мятуць, а там, дзе не насмечваюць», яны разумеюць гэта добра, хоць і не заўсёды яшчэ выдатна ведаюць рускую мову.

Для замежнікаў, якія прыязджаюць вучыцца ў нашу краіну, неабходна сустракаць такіх людзей, як Лідзія Мікіцічна. А сустракаліся з ёй амаль усе замежнікі, што вучыліся калісьці ва універсітэце. Бо працуе Лідзія Мікіцічна на сваім месцы нязменна з... 1960 года, калі ва універсітэт прыехалі за ведамі першыя студэнты з Кубы. Да гэтай пары добрым словам успамінае Лідзія Мікіцічна іх. Добра памятаюць і яе. Віншуюць са святам, дасылаючы паштоўкі. А першым чалавекам, да якога завітаў неяк, прыехаўшы ў Мінск, адзін былы в'етнамскі студэнт, была таксама Лідзія Мікіцічна Дзмітрыева.

Знаёмства з ёй яшчэ раз пераканала мяне, як важна быць працалюбівым і добразычлівым да людзей на любым месцы, дзе б ты ні працаваў. Бо не месца ўпрыгожвае чалавека. Тады прыйдзе да цябе павага і чалавечая дабрыня. І яшчэ. Умець быць патрэбным людзям можна толькі тады, калі ў цябе вялікае, шчырае сэрца. Як у Лідзіі Мікіцічны Дзмітрыевай.

НІКАЛАЎ ХРЫСТА,
студэнтка з Кіпра.

Строгая, няўмольная, непрыступная

Вахцёр — барометр парадку

ЧАСЦЯКОМ нашы студэнты лічаць, што вахцёры вельмі строгія людзі. Маўляў, не могуць зразумець інтарэсы першых і г. д.

На маю думку, любы вахцёр, асабліва калі гэта жанчына, ніколі не адмовіць у дапамозе.

Нават не, не тое. Вашы праблемы — гэта нашы праблемы, наша работа — ваша работа. Я зараз сяджу на вахце, а побач са мной — дзяўчына, студэнтка. Значыць, мы робім адну справу. Яна дапамагае мне. Як жа пасля гэтага я не змагу зразумець яе?

Галоўнае ў нашай прафесіі — паважаць студэнтаў. Бо яны зараз такія адукаваныя, інтэлігентныя. Тады і яны ўспомняць нас добрым словам.

Я працавала камендантам у студэнцкім інтэрнаце па вуліцы Машэрава пятнаццаць гадоў. І цяпер з радасцю ўспамінаю гэтыя гады. Чаму запомніліся яны? Напэўна, таму, што ў інтэрнаце вахцёры, камендант, студэнты — усе жылі адзінай сям'ёй. Студэнты былі задаволены намі, мы — імі. Хацелася б, каб заўсёды было так.

Праходзяць гады. Здаецца, зусім нядаўна былі абітурыенты, глядзіш — ужо выпускнікі. Яны ўходзяць у сваё жыццё, а мы застаемся. Мы застаемся, таму што прыходзяць новыя.

Ці ўспомняць яны пра нас? І што ўспомняць: дабрату, увагу, ветлівасць ці?..

Няхай у іх памяці застанецца толькі добрае. Бо тады і мы зможам азірнуцца назад і з палёгкай уздыхнуць...

Чаму гавораць, што вахцёры — самыя строгія людзі?

Маналог вахцёра інтэрната № 2 Еўдакіі Давыдаўны КАЗЯЛКОВАЙ
запісаў А. КАНАВАЛЕНКА,
студэнт факультэта журналістыкі.

10 сакавіка адбудзецца IV сесія Маскоўскага раённага Савета народных дэпутатаў. На абмеркаванне сесіі выносіцца пытанне «Справаздача аб рабоце выканаўчага камітэта раённага Савета народных дэпутатаў па перабудове сваёй дзейнасці».

Публікуем тэзісы даклада па гэтаму пытанню.

Выканком райсавета запрашае прыняць удзел у абмеркаванні тэзісаў і выпрацоўцы канкрэтных мер, накіраваных на паляпшэнне работы выканаўчага камітэта раённага Савета народных дэпутатаў.

Свае прапановы, заўвагі і пажаданні просьба накіроўваць у выканком райсавета па адрасу: 220036, пр. Дзяржынскага, 10 (п. 302).

СПРАВАЗДАЧА

выканаўчага камітэта Маскоўскага раённага

УХОДЗЕ перабудовы сацыяльна-эканамічнага жыцця грамадства настаў адказны перыяд пераходу да канкрэтных дзеянняў. Стратэгію і тактыку іх ажыццяўлення вызначыў чэрвеньскі (1987 г.) Пленум ЦК КПСС.

Палітычная і арганізатарская дзейнасць раённага Савета народных дэпутатаў у справаздачны перыяд была накіравана на дастойную сустрэчу 70-годдзя Вялікага Кастрычніка, паспяховае завяршэнне двух гадоў XII пяцігодкі.

Працягвалася работа па выкананню Пастановы ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму павышэнню ролі і ўзмацненню адказнасці Саветаў народных дэпутатаў за паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця ў святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС».

У 1987 годзе план вытворчасці прамысловай прадукцыі выкананы на 100,7 працэнта, звышпланавы яе выпуск перавысіў 2,3 млн. рублёў.

Тэмпы развіцця прамысловасці былі больш дынамічныя, чым гэта прадугледжана планам. Аб'ём вытворчасці таварнай прадукцыі ўзрос на 5,8 працэнта (пры плане 5,1), прадукцыйнасць працы—на 6,8 (пры заданні 5,2 працэнта). Усё павелічэнне аб'ёму вытворчасці атрымана за кошт росту прадукцыйнасці працы.

Пры заданні ў цэлым за пяцігодку павялічыць прамысловую вытворчасць на 123,3 працэнта і прадукцыйнасць працы на 124,6 за мінулы перыяд фактычна дасягнута адпаведна 109 і 109,2 працэнта. Гэта вышэй сярэднегадавых тэмпаў, прадугледжаных пяцігадовым планам.

Аднак, улічваючы гэтыя станоўчыя тэндэнцыі, члены выканаўчага камітэта добра разумеюць і тое, што на раённым узроўні робіцца сёння не ўсё магчымае для выканання ўсіх эканамічных паказчыкаў, дасягнення больш высокіх рэзультатаў. Выканком, яго планавая камісія, аддзел па комплекснаму эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю недастаткова глыбока ведаюць становішча на прадпрыемствах раёна, асабліва ў такі адказны перыяд, як пераход на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне.

Сваю першачарговую задачу мы бачым у тым, каб,наладзіўшы цесныя кантакты з прадпрыемствамі, іх эканамічнымі службамі, прынцыпова разабрацца ў працэсах, якія адбываюцца ў калектывах пры пераходзе на работу ў новых умовах, аказаць своечасовую дапамогу.

Сярод шматлікіх праблем і пытанняў, якія вырашаюцца сёння выканкомам, першаступеннае значэнне надаецца тым, якія садзейнічаюць павышэнню жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

На пасяджэнні бюро абкома, якое адбылося год назад, наша дзейнасць у гэтым напрамку была падвергнута сур'ёзнай крытыцы.

Мы змаглі папраўіць становішча ў гэтым важным пытанні, аб чым сведчаць вынікі 1987 года. План вытворчасці нехарчовых тавараў выкананы на 103 працэнты, звыш планавых заданняў выпушчана тавараў на 7,1 млн. рублёў. Больш, чым запланавана, выпушчана тавараў культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння, палепшанай якасці з індэксам «Н», асабліва модных.

Разам з павелічэннем вытворчасці тавараў народнага спажывання вялікае месца ў рабоце выканкома адводзіцца сферы паслуг насельніцтву. Сёння платныя паслугі аказваюць 89 прадпрыемстваў і арганізацый раёна. Гэта ў два разы больш, чым два гады назад.

Аднак 18 калектываў не справіліся з даведзеным заданнем.

Некаторыя кіраўнікі недаацэньваюць важнасць пастаўленай задачы, не прымаюць неабходных мер для арганізацыі выканання даведзеных заданняў.

Патрэбна самакрытычна прызнаць, што і выканком пакуль не здолеў прапанаваць кардынальных шляхоў для выканання планаў па платных паслугах.

Нам неабходна значна актывізаваць сваю дзейнасць, асабліва аддзелу па комплекснаму эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю. Надышоў час выходзіць на рашэнне практычных задач шляхам кааперацыі сіл і сродкаў працоўных калектываў. Загадчыку аддзела т. Васюку В. Н. неабходна сур'ёзна прадумаць сістэму арганізацыі гэтай работы і тэрмінова прыступіць да рэалізацыі задуманага.

Пэўная роля ў справе павелічэння вытворчасці тавараў народнага спажывання і ў павелічэнні паслуг адводзіцца кааператывам і тым, хто займаецца індывідуальнай працоўнай дзейнасцю. Зараз у выканкоме зарэгістраваны 44 кааператывы, якія аб'ядноўваюць 337 чалавек, яшчэ 112 чалавек супрацоўнічаюць з імі ў адпаведнасці з працоўнымі пагадненнямі. Вытворчую дзейнасць пачалі 26 кааператываў, якімі ў мінулым годзе выпушчана прадукцыі і аказана паслуг насельніцтву на 575,1 тыс. рублёў. 298 чалавек маюць патэнты ці рэгістрацыйныя пасведчанні на права займацца індывідуальнай працоўнай дзейнасцю.

Аднак мы не навучыліся належным чынам кіраваць кааператывамі, падпарадкоўваць іх дзейнасць патрэбам і запытам насельніцтва раёна. Дрэнна прыцягваюцца да работы тыя, хто не працуе: пенсіянеры, студэнты, домработніцы. Іх удзельная вага сярод членаў кааператываў не перавышае 15 працэнтаў. Практычна ніякага ўдзелу ў іх стварэнні не прымаюць прадпрыемствы і арганізацыі. Часта іх роля зводзіцца да падпісання пісьма, у якім выказваецца згода мець кааператыў.

Працягвалася работа па ўдасканаленню гандлю і грамадскага харчавання, план тавараабароту выкананы на 101,4 працэнта. Дадаткова рэалізавана прадукцыі на 2,3 млн. руб.

Асобае месца ў дзейнасці служб выканкома, пастаянных дэпутацкіх камісій займаюць сёння пытанні кантролю за правільным планаваннем і выкарыстаннем лімітаў дзяржаўных капітальных укладанняў на развіццё раённай гаспадаркі.

Аб'ём будаўніча-мантажных работ на аб'ектах жыллёвага, культурна-бытавога прызначэння за 1987 год склаў 47,7 млн. рублёў, або 101,2 працэнта да плана. Уведзены ў эксплуатацыю 23 жылыя дамы агульнай плошчай 191,9 тыс. м² з дзвюма ўбудаванымі ашчаднымі касамі ў мікрараёне «Паўднёвы Захад-3 і -5», магазінам «Саюздрук», домакіраўніцтвам з аб'яднанымі дыспетчарскімі службамі, піянерскімі пакоямі ў мікрараёнах «Паўднёвы Захад-5 і -6», агульнаадукацыйная школа на 1688 месц, два дзіцячыя сады па 320 месц, універсам № 32 з гандлёвай плошчай 1000 м² на Паўднёвым Захадзе-6 і шэраг аб'ектаў камунальнай гаспадаркі.

Разам з тым гэта работа праводзіцца не на належным узроўні. 25 прадпрыемстваў і арганізацый раёна (31,6 працэнта) не выкарысталі ў мінулым годзе ліміт капітальных укладанняў на 5 млн. рублёў. Не ўведзены своечасова асноўныя фонды на 3,8 млн. рублёў.

Асабліва канцралюецца выканкомам такое важнае пытанне, як забеспячэнне кожнай сям'і асобнай кватэрай. Сёння на чарзе на атрыманне жылля ў раёне стаіць больш за 13 тысяч сем'яў, з іх каля паловы стаяць на прадпрыемствах і ў арганізацыях раёна. У сярэднім сям'я атрымлівае кватэру праз 10—11 гадоў.

Для вырашэння гэтай праблемы ў горадзе заканчваецца распрацоўка мэтавай праграмы жыллёвага будаўніцтва, якая прадугледжвае вырашэнне гэтай задачы.

Не зусім зразумела, як будуць вырашаць жыллёвую праблему на заводзе «Калібр», ВА «Белмедпрэпараты», на прадпрыемствах лёгкай прамысловасці — фабрыцы імя Куйбышава і шчацінна-шчотачнай. Складзеныя імі праграмы нерэальныя і не пацвярджаюцца грашовымі і матэрыяльнымі рэсурсамі для гэтых мэт.

Патрэбна адзначыць недастатковую работу ў гэтым напрамку выканкома райсавета, намесніка старшыні І. А. Пазнякова, кватэрнага аддзела.

Адной з важнейшых сацыяльных задач з'яўляецца забеспячэнне захаванасці і належнай эксплуатацыі жыллёвага фонду, далейшае комплекснае добраўпарадкаванне нашага раёна.

За 1987 год на рамонт жыллёвага фонду затрачана 2,9 млн. рублёў. Капітальна адрамантаваны 22 дамы. Выкананы план касметычнага рамонту на 105,3 працэнта. На вытворчай базе ЖРЭА выдадзена прадукцыі на 255,7 тыс. рублёў.

У адпаведнасці з планам добраўпарадкавання раёна абсталявана і добраўпарадкавана 36 дваровых тэрыторый, дзе ўстаноўлена каля 500 адзінак спартыўнага і дзіцячага абсталявання для гульняў і г. д.

Шмат фармалізму дапускаецца жыллёвым аб'яднаннем у арганізацыі пераводу дамоў на самаабслугоўванне і грамадскую захаванасць. Рэзкае скарачэнне штатаў дворнікаў і прыбіральшчыц без папярэдняй тлумачальнай работы з жыхарамі выклікала шмат скаргаў і ў большасці выпадкаў прывяло да пагаршэння санітарнага стану дамоў і дваровых тэрыторый. Гэта прыклад таго, калі падмена канкрэтнай арганізацыйнай работы з жыхарамі папяровай бюракратыяй знішчае ў самым пачатку добрае пачынанне.

Таму пакуль што рана гаварыць аб якіх-небудзь карэнных зменах у рабоце жыллёва-камунальных служб раёна і адпаведна ў кіраўніцтве гэтай работай з боку выканкома райсавета.

Выканком райсавета пастаянна трымае на кантролі пытанні добраўпарадкавання раёна, паляпшэння яго санітарнага стану і аховы прыроды. Планавыя заданні калектывамі ГВУ «Мінскзелянбуд» і ДЭУ раёна выкананы адпаведна на 102 і 106 працэнтаў. Аднак сістэмнай, рэзультатыўнай работы нашых упраўленняў, якія займаюцца добраўпарадкаваннем раёна, за гэтымі лічбамі яшчэ не відаць.

У цэнтры ўвагі выканкома, аддзела народнай адукацыі знаходзіліся пытанні ўдасканалення зместу адукацыі, форм, метадаў і сродкаў навучання, павышэння якасці вучэбна-выхаваўчай работы, развіцця творчай ініцыятывы і актыўнасці навучэнцаў праз органы самакіравання, арганізацыі грамадска карыснай, прадукцыйнай працы, камп'ютэрызацыі вучэб-

ВОЛЬГА ІЛАРЫЁНАЎНА ІГНАЦЕНКА доўга расказвала пра справы кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, на якой працуе. Ганарыцца яна сваімі калегамі. Вось Вячаслаў Сямёнавіч Сцёпін у Маскве зараз, на павышэнні, а Алена Мікалаеўна Гурко год стажыравалася ў Японіі. А пра сябе?..

ПРА САМЫХ, САМЫХ...

Добрая, пяшчотная, патрабавальная

Дарослы свет дзяцінства

— Што тут казаць, звычайны работнік, можа крышачку горшы, чым іншыя. Вядомая ж справа: то Валодзька захварэе, то Віцька, то Надзейка. А бывае, што двое ці трое адразу.

Вырасціць і выхаваць сямёра дзяцей, безумоўна, няпроста. Адных пытанняў заўсёды — толькі паспявай адказваць: «Мама, якая розніца паміж вайной і рэвалюцыяй?», «Чаму дзеці сябруюць, а дарослыя не?».

— А ці заўсёды дзеці атрымліваюць адказы на свае «чаму»?

— Бывае, нялёгка прыходзіцца. Вось у вас ёсць дзеці?

— Так, двое.

— Што б вы адказалі, калі б хто-небудзь з іх спытаў: «Мама, а калі адбудзецца поўнае раззбраенне, на дзіцячых цацках ракеты таксама здымуць ці пакінуць?»

— Адразу і не сарыентуешся.

— Дапытлівасць — неабходная і важная ўмова разумовага развіцця. З дапамогай гэтага дзеці арыентуюцца ў навакольным асяроддзі. Свет дзяцінства не такі ўжо дзіцячы, а хутчэй дарослы.

— А хто ў сям'і больш займаецца выхаваннем: мама ці тата?

— Хапае ўсім, але больш усё ж дастаецца маці.

— Як Вы паспяваеце спраўляцца: і дома, і на рабоце? Педагагічная праца патрабуе шмат часу, асабліва на самападрыхтоўку.

— Гэта, напэўна, асноўная мая цяжкасць — недахоп часу. Кандыдацкую дысертацыю ўжо даўно патрэбна было б абараніць, а я яшчэ працую над ёй. У бібліятэку вырвацца — праблема. На жаль, ноччу яна не працуе (жартую). Збегаеш хіба толькі тады, калі няма заняткаў. Муж, праўда, паспявае: абараніў і кандыдацкую, і доктарскую, напісаў чатыры кнігі.

— Вядомы педагог А. С. Макаранка гаварыў, што вялікае значэнне ў выхаванні дзяцей адыгрывае праца. Ці прытрымліваецеся такога меркавання Вы?

— Мы стараемся прывіць дзецям павагу і любоў да любой працы. Як гэта ў нас атрымаецца — пакажа жыццё. А пакуль даручаем усякую работу, якая ім пад сілу: схадзіць у магазін, прыбраць кватэру, дапамагчы што-небудзь на кухні, прапалоць градкі на дачы.

— Кажуць, калі дзіця выканала дадзенае даручэнне нядрэнна, яго абавязкова трэба пахваліць: у наступны раз яно пастараецца яшчэ лепш.

— Магчыма, яно і так. Толькі бывае не ведаеш, што рабіць: хваліць ці караць.

Аднойчы прыходжу дамоў, а ў кватэры поўны гармідар. Усе бегаюць, нешта цягаюць, вытрасаюць, словам, ідзе ўборка. Толькі Лёнькі не відаць. Аказваецца, ён перашкаджаў, і яго, каб не блытаўся пад нагамі, закрылі ў кабінеце таты. Заглядваю туды, а ён так старанна мые насавой хусцінкай (дзе толькі ўзяў?) падлогу. Усю вымыў. Вось і рашай: хваліць за гэта ці караць.

— Вольга Іларыёнаўна, хутка 8 Сакавіка. Ці любяць у сям'і гэта свята?

— Вельмі, як, між іншым, і ўсе астатнія. Свята — гэта заўсёды нешта неардынарнае, прыемнае. Асабліва падабаюцца ўсім перадсвяточныя клопаты. Да 8 Сакавіка дзеці стараюцца рыхтаваць падарункі маме і бабулі самі. Дзяўчынкі любяць гатаваць. Пасля пачынаецца сапраўдны канцэрт: хто спявае песні, хто чытае вершы, хто танцуе. Робяць гэта заўсёды з вялікім задавальненнем — маміна ж свята.

...Я лічу, што не трэба шкадаваць ні сіл, ні часу, каб выхаваць сваіх дзяцей дужымі, добрымі, цікаўнымі, духоўна багатымі. Пераканана: вашы намаганні не пройдуць дарэмна.

Запісала
З. АЛЯШКЕВІЧ.

Дзявочы факультэт

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й і 2-й стар.).

Ален Прыгожых... А гэта небяспечна. Самі разумееце, у каго можа ператварыцца Алена Прыгожая, якую абышлі ўвагай.

Можа таму і ў паэзіі мужчын філфака (а ў нас кожны другі — паэт, астатнія — празаікі) амаль няма любоўнай лірыкі, з апаскі, каб яна не стала яблыкам разладу паміж дзяўчатамі, якія безнадзейна пачнуць шукаць у сваіх радах крыніцу натхнення?

Я. НЕШЧАСЛІВЫ.

Чарнавокая, смелая, спрытная

Жыла ў Гаване Алёнка

Спатканне з Алёнкай (другіх варыянтаў імя ні мама Ніна Пікулік, ні тата Эрнста Сейхас, ні сама інтэрв'юіруемая пакуль не прызнаюць) пачалося з падарунка.

Каб не перашкаджаць дарослым у час іх размовы, яна заўсёды займаецца сваімі справамі. Але ж часам немагчыма стрымаць сябе. Тады Алёнка пачынае дзейнічаць рашуча:

— Хочаш, падару табе свой малюнак?

Праз хвіліну я трымаю ў руках паперку, з якой пасміхаецца намаляваная Снягурка. Задаволеная, па-даросламу разважліва пачынае яна расказваць:

— Я маляваць люблю. Бачыш, колькі ў мяне каляровых алоўкаў?

Калі табе ўсяго пяць гадоў, цікавага вакол — не пералічыць. Асабліві клопат — любімыя цацкі. Гэта толькі дарослыя не заўважаюць, на самай жа справе без дабрыні і пяшчоты зайка-барабаншчык і мішка-буркунь, як дзеці, становяцца сумнымі.

У такой спрытнай, гаваркой і смяшлівай дзяўчынкі павінна быць многа сяброў.

— А як жа! І ў дзіцячым садзе, і ў бабулі на Украіне, і ў сонечнай Гаване, дзе раней працавалі ва універсітэце мама і тата. Зараз тата прыехаў у Мінск на стажыроўку. І мы за ім. Мы ж сям'я. Хутка вернемся дадому.

— Тата — фізік, мама — матэматык. А ты кім хочаш быць?

— Калі стану дарослай? Алёнай буду. Алёнай Сейхас.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ,
студэнтка факультэта
журналістыкі.

АБ РАБОЦЕ — ТЭЗІСЫ ДАКЛАДА

Савета народных дэпутатаў па перабудове сваёй дзейнасці

на-выхаваўчага працэсу, пераходу на навучанне з шасці гадоў, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў народнай адукацыі.

У раёне праведзена значная работа па пераходу на навучанне з шасці гадоў. Аднак ёсць тут і істотныя недахопы. У цяжкім становішчы знаходзяцца шасцігодкі ў школах старой забудовы, не відно рэальных перспектыў паляпшэння і ў школах Паўднёвага Захаду, дзе колькасць першых класаў у гэтым навучальным годзе складае 8 — 12 на кожную школу. Па-ранейшаму застаюцца вострымі пытанні арганізацыі медыцынскага абслугоўвання і гарачага харчавання шасцігодак.

За прайшоўшы час адбылося значнае павелічэнне колькасных паказчыкаў па арганізацыі прадукцыйнай і грамадска карыснай працы. Эканамічны эфект ад прадукцыйнай працы школьнікаў складае 62 тыс. рублёў. Але сёння ўзнікае заканамерное пытанне: ці маюць райана, педкалектывы школ дакладнае ўяўленне аб перспектывах арганізацыі прадукцыйнай і грамадска карыснай працы? Наўрад ці дасць належны эфект механічнае павелічэнне колькасці рабочых месц. Неарганізавана адбываецца выбар аб'ектаў працы, з году ў год не мяняецца наменклатура вырабаў школьнікаў. Такое становішча не можа не прывесці да застою, фармалізму, страты інтарэсу школьнікаў да працоўнай дзейнасці.

Недастаткова эфектыўна выкарыстоўваюцца ўстановамі райана сродкі, якія ім выдзяляюцца. Часам яны трацяцца на ўпрыгажэнства, набыццё штор, дываноў, а не на аснашчэнне вучэбна-выхаваўчага працэсу. Дрэнна наладжана захаванне і выкарыстанне мэблі і абсталявання, ёсць факты набыцця новай мэблі, калі старая яшчэ не спісана. Сур'ёзныя нараканні можна выказаць у адрас школ і дзіцячых дашкольных устаноў у пытанні выкарыстання вучэбна-матэрыяльнай базы. Вялікая работа, напрыклад, праведзена па стварэнню спартыўнай базы, але аддача пакуль невялікая, а спортгарадкі часта з'яўляюцца ўпрыгажэннем тэрыторыі школы, аргументам актыўнай работы для правяраючых. Райана неабходна больш прынцыпова вырашаць пытанні выкарыстання сродкаў падведамаснымі ўстановамі, удасканалення матэрыяльнай базы вучэбна-выхаваўчага працэсу.

З году ў год не вырашаецца ў раёне пытанне развіцця тэхнічнай творчасці, ёсць праблемы з арганізацыяй гуртковай і секцыйнай работы, вольнага часу навучэнцаў. Нядбайныя адносіны да такой важнай справы прывялі да злачыннасці, п'янства, іншых негатыўных з'яў. Дастаткова сказаць, што колькасць злачынстваў сярод школьнікаў у 1987 годзе выраслa ў параўнанні з 1986 удвая.

Неэфектыўныя яшчэ формы супрацоўніцтва школ з працоўнымі калектывамі, грамадскасцю.

Адказныя задачы стаяць перад педагагічнымі калектывамі, райана, выканкомам па рэалізацыі рашэнняў лютаўскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС.

Пад неаслабным кантролем выканкома і пастаяннай дэпутацкай камісіі па ахове здароўя, сацыяльнаму забеспячэнню, фізкультуры і спорту знаходзяцца і пытанні развіцця аховы здароўя.

Больш змястоўнымі і разнастайнымі сталі формы арганізацыі адпачынку насельніцтва: раённыя святы, святы вуліц, двароў, масавыя спартыўныя спаборніцтвы і старты. Гэтаму садзейнічала дзейнасць раённага культурна-спартыўнага комплексу, створанага ў 1985 годзе, які змог аб'яднаць намаганні і фінансавыя магчымасці прадпрыемстваў раёна, культурна-асветніцкіх устаноў і саветаў грамадскасці.

Аднак выканкомам райсавета зроблена далёка не ўсё. Нас не можа задаволіць тое, што новыя формы ў рабоце з насельніцтвам практычна адсутнічаюць, жыхары па-ранейшаму застаюцца ў ролі пасіўных гледачоў. Мы яшчэ дрэнна ведаем актывістаў, якія б займаліся грамадскай работай.

Для арганізацыі адпачынку працоўных не заўсёды эфектыўна выкарыстоўваюцца памяшканні ЖЭСаў, якія выдзелены для гэтых мэт. Райвыканкому патрэбна сумесна з ЖРЭА у бліжэйшы час правесці пашпартызацыю і забяспечыць максімальную занятасць усіх памяшканняў ЖЭСаў, якія прызначаны для работы з насельніцтвам, вызначыць канкрэтныя задачы па іх выкарыстанню для раённага камітэта ДТСААФ, фізкультурна-аздараўленчай службы, ДСФА прафсаюзаў, савета ветэранаў вайны і працы, жансавета, раённых таварыстваў барацьбы за цвярозасць, аховы помнікаў, рыбаловаў і паляўнічых і г. д.

Выканком райсавета ў апошні час шмат увагі ўдзяляе ўдасканаленню работы па кіраўніцтву ўстановамі культуры, аднак станоўчыя рэзультаты не дасягнуты. Пытанне «Аб стане матэрыяльна-тэхнічнай базы клубных устаноў» было разгледжана на пасяджэнні выканкома. Аналіз паказаў, што пяць з сямі клубаў і дамоў культуры па матэрыяльнай базе не адпавядаюць сучасным патрабаванням. Клуб МВАА «Прамень», ДК ВБМА «Прамбудмантаж» знаходзяцца ў аварыйным стане, клуб БДУ імя У. І. Леніна размешчаны ў прыстасаваным памяшканні. Адсутнічае дакладная перспектыва развіцця і ўмацавання матэрыяльнай базы студэнцкага клуба ў кіраўніцтва педінстытута.

У кіраўнікоў В. Б. Вернікоўскага, Я. М. Ташчакова, С. М. Раўкова трывала ўкаранілася інерцыя старога, шаблонны стэрэатып мыслення, «астаткавы прынцып» у адносінах да ўстаноў культуры.

Выканком райсавета ў пытаннях удасканалення арганізацыйна-масавай работы ў справаздачны перыяд выкарыстоўваў не толькі назапашаны вопыт, але і з улікам сучасных патрабаванняў прымаў меры па актывізацыі тэрытарыяльных і вытворчых груп.

Вялікая ўвага ўдзялялася павышэнню ролі сесій. За справаздачны перыяд райсаветам праведзена чатыры сесіі, разгледжана трыццаць розных пытанняў. У падрыхтоўцы сесій прымаюць удзел працоўныя калектывы, грамадскасць, насельніцтва раёна.

У справаздачны перыяд выканаўчы камітэт стаў больш увагі ўдзяляць пытанням сацыяльна-культурнага будаўніцтва. На праведзеных 25 пасяджэннях выканкома было разгледжана 235 пытанняў, з якіх 24 асноўныя.

На другой сесіі райсавета VI скліканння зацверджаны мерапрыемствы па выкананню наказаў выбаршчыкаў. Да выканання прыняты 21 наказ. З дзевяці наказаў, якія меркавалі выканаць у мінулым годзе, цалкам выкананы сем. Так, выдзелена памяшканне ў мікрараёне «Паўднёвы Захад-5», у якім адкрыты філіял 15-й дзіцячай паліклінікі, адбудаваны лесвічны пераход ад пр. Дзяржынскага да жылога раёна па вуліцы Шчукіна, адрамантаваны хлебны магазін № 42 па вул. 2-й Землямернай і інш.

Адзін наказ выконваецца і адзін не выкананы. Гэта наказ па арганізацыі стаматалагічнага абслугоўвання дзяцей, якія жывуць у мікрараёне «Паўднёвы Захад». Для яго рэалізацыі патрэбна праявіць большую настойлівасць МДМІ, раённаму аддзелу аховы здароўя, райана, дэпутату А. І. Кубарка.

З мэтай пашырэння галоснасці ў дзейнасці райсавета і яго органаў шырока выкарыстоўваюцца такія формы работы, як правядзенне выязных пасяджэнняў выканкома, пастаянных камісій, «дзён адкрытага пісьма», арганізавана тэлефонная «прамая лінія» з кіраўніцтвам выканкома райсавета.

Патрэбна таксама адзначыць, што далёка не ўсе дэпутаты перабудавалі сваю работу. Некаторыя з іх рэдка бываюць у выбарчых акругах, не падтрымліваюць цесную сувязь з выбаршчыкамі, а таксама з прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі, грамадскімі органамі самакіравання, размешчанымі на тэрыторыі акругі. Часам некаторыя дэпутаты забываюць аб адказнасці за сваю дзейнасць перад выбаршчыкамі, якіх яны прадстаўляюць у Савеце.

Зроблены аналіз прыёму дэпутатамі сваіх выбаршчыкаў паказвае, што некаторыя народныя выбраннікі не робяць гэтага прыёму.

У паўсядзённай рабоце з дэпутацкімі фарміраваннямі акрэсліваецца такая праблема, як выхаванне актыўнасці кожнага дэпутата. А яна пакуль не высокая. І ў гэтым ёсць віна выканкома райсавета, яго аддзелаў і служб. Намеснік старшыні, сакратар выканкома, загадчыкі аддзелаў не здолелі навучыць дэпутатаў, накіраваць іх намаганні на дасягненне пастаўленай мэты.

Пастаянныя камісіі замацавалі за кожным дэпутатам пэўны напрамак работы. Але канкрэтных рэзультатаў пакуль не відно. Тут шырокі дыяпазон работы для кіраўніцтва камісій. Але і выканком не павінен заставацца ўбаку. Арганізацыйна-інструктарскі аддзел яшчэ не змог перабудаваць сваю работу па-новаму, не дасягнуў дакладнай каардынацыі дзейнасці камісій, не аказаў ім неабходнай метадычнай дапамогі.

Ва ўмацаванні новага стылю работы, безумоўна, вялікая роля дэпутацкіх тэрытарыяльных груп. У іх выканком бачыць сродак павышэння ролі дэпутатаў ва ўмовах дэмакратыі і галоснасці, вызвалення ад перадатачных функцый (выбаршчык-дэпутат-выканком).

Дэпутаты павінны праяўляць настойлівасць, каб рэкамендацыі групы былі выкананы адпаведнымі службовымі асобамі. Для гэтага патрэбна шырэй выкарыстоўваць дэпутацкія пасты, правядзенне грамадскіх пасяджэнняў. Але самае галоўнае, што павінна быць узята на ўзбраенне дэпутацкімі групамі,— гэта цесны кантакт з жыхарамі мікрараёнаў.

Адпаведна патрабаванням Канстытуцыі СССР і БССР і Закона СССР «Аб статусе народных дэпутатаў у СССР» дэпутаты павінны трымаць справаздачу перад выбаршчыкамі не радзей аднаго разу ў год.

Справаздачы дэпутатаў у 1987 годзе праводзіліся ў індывідуальным парадку. Аднак цалкам пазбегнуць фармалізму ў іх правядзенні мы не змаглі. Патрэбна спыніць практыку правядзення справаздач на бацькоўскіх сходах, таму што наўмыснае збіранне аўдыторыі не дасягне патрэбнага рэзультату. У пытаннях удасканалення арганізацыйна-масавай работы хацелася б бачыць больш канструктыўны падыход сакратара выканкома А. А. Яновіча, аргінструктарскага аддзела.

Абмеркаванне справаздачы выканкома райсавета аб перабудове сваёй дзейнасці павінна прайсці зацікаўлена. Неабходна выявіць недахопы ў рабоце выканкома, вызначыць шляхі ўдасканалення работы ў гэтым напрамку. Уклад раённага Савета народных дэпутатаў і яго выканкома ў перабудову павінен быць больш істотным, чым сёння. Над гэтым мы і будзем працаваць.



ХОЧАЦЦА БЫЦЬ ПРЫГОЖАЙ, АБАЯЛЬНАЙ, КРЫХУ ЗАГАДКАВАЙ, ДОБРАЙ, ПЯШЧОТНАЙ, ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНАЙ І НЕВЕРАГОДНА ЖАНОЦКАЙ.

ХОЧАЦЦА БЫЦЬ УВАЖЛІВЫМ, ГАЛАНТНЫМ, ГАТОВЫМ НА ЎСЁ, НАВАТ НА БЕСПЕРАПЫННАЕ ГАВАРЭННЕ КАМПЛІМЕНТАЎ, ПРЫЗНАННЯЎ, ХОЧАЦЦА БЫЦЬ НЕВЕРАГОДНА МУЖНЫМ.

І ЎСЁ ГЭТА НЕ МОЖА БЫЦЬ ПРАЗМЕРНЫМ, КАЛІ ПАЖАДАНАЕ ЗБЫВАЕЦЦА 8 САКАВІКА.

ЧАГО НЕ ЗРОБІШ ДЛЯ ЖАНЧЫН...

НІШТО ЖАНЧЫНЫ так не цэняць у мужчынах, як залатыя рукі.

А калі ёсць падстава даказаць, што яны растуць у вас адтуль, адкуль трэба — мо, паспрабуем?

Тым больш, што свой падарунак вы можаце падарыць не толькі каханай ці маці або сястрычцы, але і дзяўчынкам-суседкам па блоку.

Калі вы прыслухаецеся да нашых парад, паверце, вас чакае самая бурная рэакцыя з боку віноўніц свята.

З малатком і фартухам

ПАРАДА 1.

Гэтыя вешалкі можна зрабіць з самых простых матэрыялаў, якія вы знойдзеце без цяжкасці: старой драўлянай лыжкі і палавінкі кароткай драўлянай качалкі. Лыжка павінна быць старой не з-за лішняй эканоміі, а таму, што выцерты часам малюнак будзе прыгожа глядзецца на фоне сучаснай кухні. Выраб вешалкі не абцяжарыць вас. Кароткімі болцікамі з двух канцоў лыжкі прышрубуйце два металічныя калечкі, а са знешняга боку праз роўныя інтэрвалы замацуйце маленькія кручкі. Замацаваная ля сцяны лыжка-вешалка добра ўпішацца ў агульны інтэр'ер кухоннага памяшкання. На яе можна будзе павесіць камплект прыхватак і рушнік.

Па гэтаму ж прынцыпу ў вешалку можна ператварыць і качалку. Некалькі цяжэй будзе раздзяліць яе папалам, для чаго спатрэбіцца стужачная піла. З дзвюх палавін качалкі атрымаюцца дзве вешалкі для кухні.

ПАРАДА 2.

Стала ўжо няпісанай традыцыяй, калі мужчыны на 8 Сакавіка дэманструюць свае кулінарныя здольнасці.

Не будзем ленавацца і на гэты раз. Падпераж-мся фартухам і загадаем стварыць... Ну што-небудзь немудрагелістае і смачнае. Напрыклад, жэле ці пончыкі.

Лімоннае жэле. Наліць у каструлю 3 шклянкі вады, усыпаць цукар, размяшаць і ўскіпяціць. У гарачы сіроп пакласці цэдру, зрэзаную з паловы лімона і, пажадана, напярэдадні замочаны і выжаты. Сіроп зноў давесці да кіпення, памешваючы лыжкай, і ўліць лімонны сок.

На 1 лімон: 1 шклянка цукру, 25 г жэлаціну.

Пончыкі.

Ваду з цукрам, лімонам і маслам давесці да кіпення, хутка мяшаючы. Усыпаць муку, працягваючы хутка мяшаць масу яшчэ 2 — 3 мінуты, пакуль цеста не пачне адмяжоўвацца ад сценак каструлі. Зняць з агню і ўвесці адно за адным яйкі, бесперапынна памешваючы, каб не было камякоў. Дзвюма чайнымі лыжкамі апускаць шарыкі з цеста ў тлушч, які кіпіць, і жарыць, пакуль пончыкі не павялічацца ў аб'ёме і не падрумяняцца. Адцадзіць на папяровай салфетцы ад масла. Потым муку спалучыць з цукрам для сіропу і паступова растварыць у вадзе. Варыць, памешваючы, да згушчэння. Дабавіць масла і ваніль. Пры гэтым неабходна бесперапынна памешваць. Пончыкі і сіроп падаваць у асобным посудзе.

Спатрэбіцца: 3 ст. лыжкі сметанковага масла, 1/4 шклянкі цукру, 2 чайныя лыжкі цэдры лімона, 1 шклянка вады, 1 шклянка мукі, 4 яйкі, расліннае масла для жаркі; для сіропу — 1 шклянка цукру, 2 поўныя ст. лыжкі мукі, 1 шклянка вады, 2 ст. лыжкі сметанковага масла, 0,10 г ваніл.

ВІНШУЕМ СВАІХ ШАНОЎНЫХ ЧЫТАЧАК. І ШЧЫРА ЖАДАЕМ УСІМ ІМ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭННЯ БЫЦЬ ЧАРАЎНІЦАМІ, ЗАКАХАНЫМІ І КАХАНЫМІ. А ЯШЧЭ — СУСТРЭЦЬ СВАЮ БЛАКІТНУЮ ПТУШКУ, ЯКАЯ ПРЫНОСІЦЬ ВЯЛІКАЕ ШЧАСЦЕ, І НЕ РАССТАВАЦЦА З ЕЙ.



ДЛЯ ЖАНЧЫН любога ўзросту, нават маладзіцы, вельмі важна, каб ад яе твару павявала свежасцю, каб ён выглядаў святло і быў пяшчотным, нібы толькі ўмыты мядовай расой.

Ніякія крэм-пудры, румяны, крэмы не змогуць зрабіць яго такім прыгожым і прывабным, як маскі, закліканыя асвяжаць. Актуальнасць асвяжальнай маскі ранняй вясною тым больш відавочная, калі мы зазіраем у халадзільнік і бачым там з «вітамінаў», у лепшым выпадку, лімон і кансерваваны агурок. Мала таго, што скура дрэнна вітамінізуецца, дык яшчэ праходзіць выпрабаванне на вецер і перапад тэмператур. Паглядзіце ўніз, на свае боты. Колькі разоў у тыдзень даглядаеце вы іх? А ў які тым не менш прыйшлі яны стан? Пэўна ж, пяшчотная скура твару патрабуе і заслугоўвае большай увагі.

Не пашкадуйце гадзіны перад люстэркам. Ніякая сукенка так не ўпрыгожыць нас у свята, як прыгожы, свежы твар!

Найперш, чым займацца маскай, пакладзіце на твар гарачы кампрэс на дзве-тры мінуты (ноздры, губы не накрываць!), выкарыстоўваючы байкавую матэрыю ці махровы рушнік (напярэдадні прамакніце ў гарачай вадзе і злёгку выкруціце). Гэты кампрэс добра падрыхтоўвае скуру да наступнай працэдуры — касметычнай маскі, паляпшае лімфа і кровазварот, расшырае поры, павышае ўсмоктваючыя здольнасці скуры.

Калі ёсць магчымасць, пачніце выкарыстоўваць маскі за як мага большы час да дня, на які рыхтуецеся (ідэальна — за 2—3 тыдні), ад двух да пяці разоў у тыдзень і абавязкова зрабіце маску напярэдадні свята.

КАКЕТКА

Важней за ўбранне

ДЛЯ СУХОЙ СКУРЫ.

Жаўткова-масленая маска. Вельмі карысная пры нармальнай, сухой і скуры, якая лушчыцца і лёгка раздражняецца, а таксама пры паяўленні першых маршчын, асабліва вакол вачэй. Маску належыць рабіць сістэматычна, ад аднаго да трох разоў у тыдзень.

Яйкавы жаўток размяшайце з чайнай лыжкай мёду і сталовай лыжкай раслінага (аліўкавага) масла ці смятаны. Маску нанесці роўным слоем на 20 — 30 мінут, пасля чаго зняць ватным тампонам, змочаным цёплай вадой.

ДЛЯ ТЛУСТАЙ СКУРЫ

Бялкова-пергідролевая маска

Узбіць да пенкі бялок, прыбавіўшы лыжачку трохпрацэнтнай перакісі вадароду і лімонны сок. Сумесь наносіць на твар кожныя тры-пяць мінут ватным тампонам да таго, пакуль яна не скончыцца. Шануйце бровы і павекі. Іх лепш напярэдадні намазаць раслінным тлушчам ці крэмам, каб яны не абясколерыліся. Праз 15 — 20 мінут маску змыць прахладнай вадой.

Індыйская маска

Узяць па чайнай лыжцы мёду, кіслага малака, мукі (крухмалу), солі і перамяшаць да ўтварэння кашападобнай сумесі. Наносіць на твар ватным тампонам, пласт за пластом, пакуль сумесь не скончыцца. Потым твар вымыць цёплай і прахладнай вадой. Гэта маска карысная для тлустай скуры з расшыранымі порамі і маршчынамі. Асвятляе скуру.

УНІВЕРСАЛЬНЫЯ МАСКІ

Гэту маску можна прымяняць незалежна ад стану твару (пры нармальнай, сухой і тлустай).

Да кашыцы з аднаго ці двух кавалкаў варанага гарбуза прыбавіць яйкавы жаўток і лыжачку мёду. Маску нанесці яшчэ цёплай. Праз 10 — 15 мінут змыць прахладнай вадой.

Лячэбная маска з рамонку

Рэкамендуецца пры любым тыпе скуры твару, асабліва пры вуграх ці скуры, якая часта запаляецца.

Тры сталовыя лыжкі рамонку (рамонак можна набыць на Камароўскім рынку) заліць шклянкай кіпятку. Калі кветкі стануць мяккія, пакласці іх на твар, пакрыць марляй і трымаць 30 мінут. Маску змыць прахладнай вадой.

І яшчэ. Неабходны ўмовы, якімі, калі грэбаваць, толькі шкодзіць сабе. У час накладвання маскі нельга гаварыць, хадзіць, смяяцца. Трэба легчы на ложак, заплюшчыць вочы і максімальна расслабіцца.



«З ЛЮБОЎЮ ДА ЖАНЧЫНЫ» — так завецца святочны вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню. Адбудзецца ён 5 сакавіка ў памяшканні Палаца культуры чыгуначнікаў імя У. І. Леніна.

У студклубе яшчэ маюцца білеты. Спяшайцеся набыць.



ЗАЛАТАЯ ІГОЛАЧКА

ІСПАНСКАЯ СПАДНІЦА

Іспанскі стыль не хоча выходзіць з моды. Яго галоўныя рысы — каларытнасць, вытанчанасць, жаноцкасць, фальклорныя матывы народнага адзення. Асаблівая ўвага надаецца таліі. Таму прапаноўваемая мадэль падыдзе да тонкіх, высокіх дзяўчат.

Паўжыння да паловы лытак. Тры пышныя прысабраныя фальбоны прышыты да какеткі, якая шчыльна ляжыць на клубах. Гарсэт шыецца асобна з іншага матэрыялу, не забудзьцеся на кантрасную тасьму.

1/2 перада

Выкрайка на фігуру з аб'ёмам таліі 68 см і аб'ёмам клубаў — 94 см.

На спадніцу трэба 2,20 м матэрыялу (пры шырыне 1,40 м), на гарсэт — 0,70 м (пры шырыне 0,90 м).

Абмаляваць какетку ў натуральнай велічыні (бесперапынная лінія). Выкрайка гарсэта (на аснове какеткі вызначана лініяй пункцірнай).

Пры раскроі какеткі дадаць на швы. Для верхняй фальбоны выкраіць 2 прамавугольнікі — 87 ×26 см, на сярэднюю — 2 прамавугольнікі — 140×26 см, на ніжнюю — 4 прамавугольнікі — 115×26 см. Акрамя таго, выкраіць пояс — 73×8 см.

ВЫКАНАННЕ. Какетку шыць па праваму боку. Пасшываць фальбоны. Доўгую, ніжнюю фальбону сшыць так, каб швы размеркаваліся па баках і па цэнтры спераду і ззаду. На левым баку какеткі прышыць «маланку». Верх спадніцы прышыць да пояса.

ГАРСЭТ. Перад і спінку скроіць двойчы з матэрыялу (прыбавіць на швы) і адзін раз з бартоўкі. Пакласці бартоўку на левы бок верхняй часткі, пасля чаго пасшываць на баках часткі верху і нізу. У зробленых закругленых швах зрэзаць на рожках і вывернуць гарсэт на правы бок праз падпораты бакавы шоў у спадніцы. Край змятаць, абкідаць. Фрагмент шва ўнізе шыць уручную. Напярадзе прабіць круглыя дзіркі, уцягнуць тасьму.

1/2 спінкі



Пераклад з польскай.

Чарговы выпуск «Для цябе» падрыхтавала А. Віхрова, мастакі А. Жукава, В. Яцкоўскі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

3 сакавіка
Зак. 1613.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.